# Историография

# Гістарыяграфія

# Historiography

УДК 94(476):930

## КОНФЕССИОНАЛЬНЫЕ КОНВЕРСИИ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в.: ОБЗОР ИСТОРИОГРАФИИ

***М. М. КОРОЛЬ***[1)]

[1)]*Национальный исторический архив Беларуси, ул. Кропоткина, 55, 220002, г. Минск, Беларусь*

Рассмотрены этапы становления историографии, посвященной проблемам конфессиональных преобразований во второй половине XIX в. на территории белорусских губерний. Выделены и проанализированы историографические направления, сформировавшиеся с конца XIX до начала XXI в. Отмечается, что дореволюционные исследователи прежде всего стремились доказать добровольность переходов в православие, но в этот период также создавались труды, в которых этот тезис ставился под сомнение. Утверждается, что в советское время вопрос переходов из католицизма в православие практически не затрагивался. Изучаются особенности отечественной и зарубежной историографии на современном этапе, когда появилось большое количество работ по религиозной проблематике, в том числе конфессиональным конверсиям. Часть исследователей в своих подходах и оценках продолжают традиции дореволюционной историографии, но большинство современных ученых стремятся дать объективную картину религиозных процессов на белорусских землях, показать их в контексте общей государственной политики. Актуальность статьи обусловлена освещением различных точек зрения на проблему конфессиональных переходов.

***Ключевые слова:*** историография; религия; конфессиональные конверсии; Российская империя.

**Образец цитирования:**
Кароль ММ. Канфесійныя канверсіі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: агляд гістарыяграфіі. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2021;1:82–89.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-1-82–89

**For citation:**
Karol MM. Confessional conversions on the territory of Belarus in the second half of the 19th – early 20th century: overview of historiography. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2021;1:82–89. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-1-82–89

**Автор:**
***Маргарита Михайловна Король*** – старший научный сотрудник отдела научно-издательской и публикационной деятельности.

**Author:**
***Marharyta M. Karol***, senior researcher at the research and publishing department.
*karolmarharyta@gmail.com*

# КАНФЕСІЙНЫЯ КАНВЕРСІІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.: АГЛЯД ГІСТАРЫЯГРАФІІ

***М. М. КАРОЛЬ***[1*]

[1*]*Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, вул. Крапоткіна, 55, 220002, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца этапы фарміравання гістарыяграфіі, прысвечанай праблематыцы канфесійных канверсій у другой палове XIX ст. на тэрыторыі беларускіх губерняў. Вылучаюцца і аналізуюцца гістарыяграфічныя напрамкі, якія сфарміраваліся з канца XIX да XXI ст. Адзначаецца, што дарэвалюцыйныя даследчыкі найперш імкнуліся даказаць добраахвотнасць пераходаў у праваслаўе, але ў гэты перыяд таксама ствараліся працы, у якіх гэты тэзіс ставіўся пад сумненне. Сцвярджаецца, што ў савецкі час пытанне пераходаў з каталіцызму ў праваслаўе амаль не закранаяся. Даследуюцца асаблівасці айчыннай і замежнай гістарыяграфіі на сучасным этапе, калі з'явілася вялікая колькасць прац, прысвечаных рэлігійным праблемам, у тым ліку канфесійным канверсіям. Частка даследчыкаў у сваіх падыходах і ацэнках працягваюць традыцыі дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі, але большасць сучасных навукоўцаў імкнуцца даць аб'ектыўную карціну рэлігійных працэсаў на беларускіх землях, паказаць іх у кантэксце агульнай дзяржаўнай палітыкі. Актуальнасць артыкула абумоўлена асвятленнем розных пунктаў гледжання на праблему канфесійных пераходаў.

***Ключавыя словы:*** гістарыяграфія; рэлігія; канфесійныя канверсіі; Расійская імперыя.

# CONFESSIONAL CONVERSIONS ON THE TERRITORY OF BELARUS IN THE SECOND HALF OF THE 19$^{th}$ – EARLY 20$^{th}$ CENTURY: OVERVIEW OF HISTORIOGRAPHY

***M. M. KAROL***[a]

[a]*National Historical Archives of Belarus, 55 Krapotkina Street, Minsk 220002, Belarus*

The article examines the stages of the formation of historiography devoted to the problems of confessional conversions in the second half of the 19$^{th}$ century on the territory of the Belarusian provinces. The historiographic trends that formed from the end of the 19$^{th}$ century to the beginning of the 21$^{st}$ century were identified and analysed. The authour studies the peculiarities of Belarusian and foreign historiography at the present stage, when a large number of works on religious issues has appeared, including confessional conversions. It is argued that in Soviet times, the issue of transitions from Catholicism to Orthodoxy was practically not touched upon. In their approaches and assessments, some researchers continue the traditions of pre-revolutionary historiography, but the majority of modern scientists strive to give an objective picture of religious processes on the Belarusian lands, to show them in the context of general state policy. The relevance of the article is due to the coverage of various points of view on the problem of confessional conversions. It is noted that pre-revolutionary researchers, first of all, sought to prove the voluntariness of conversions to Orthodoxy, but during this period, works were also created in which this thesis was questioned.

***Keywords:*** historiography; religion; confessional conversions; Russian Empire.

## Уводзіны

Пытанне ўзаемаадносін розных веравызнанняў традыцыйна выклікае цікавасць даследчыкаў гісторыі Беларусі. Канфесійныя канверсіі, якія адбываліся на беларускіх землях у другой палове XIX ст., у гэтым плане не з'яўляюцца выключэннем. Змены ў рэлігійнай палітыцы ўлад Расійскай імперыі, якія пачаліся пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг., адразу знайшлі водгук у сучаснікаў падзей. У перыядычным друку рознай грамадска-палітычнай скіраванасці з'ўляліся артыкулы, дзе аўтары імкнуліся даць ацэнку пераводам каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе. Цэнтральнай тэма становішча праваслаўнай царквы на тэрыторыі Беларусі, яе ўзаемадачыненняў з каталіцызмам стала для такіх выданняў, як «Веснік Заходняй Расіі» (пад рэдакцыяй К. Гаворскага) і «Епархіяльныя ведамасці», якія выходзілі ў цэнтрах праваслаўных епіскапстваў. Асаблівасцю гэтых выданняў з'яўлялася выразная антыкаталіцкая пазіцыя.

Гістарыяграфія вывучэння міжканфесійных пераходаў на беларускіх землях падзяляецца на некалькі этапаў. На працягу першага з іх (другая пало-

ва XIX – пачатак XX ст.) гэта пытанне асэнсоўвалася сучаснікамі падзей, якія ў некаторых выпадках нават з'яўляліся ўдзельнікамі пераводаў каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе. Для наступнага этапу (1920–80-я гг. – час функцыянавання савецкай гістарычнай навукі) была характэрна слабая ўвага да вывучэння рэлігійнага жыцця ў Беларусі. Трэці этап, які пачаўся ў 1990-я гг., адрозніваецца ўзрастаннем цікавасці да праблематыкі канфесійных канверсій, што было абумоўлена агульным ростам навуковай і грамадскай цікавасці да рэлігійных аспектаў мінулага Беларусі.

## Асноўная частка

Часам фарміравання прафесійнай гістарыяграфіі, якая разглядала праблематыку канфесійных канверсій, можна лічыць канец XIX ст. Працы гэтага перыяду насілі не толькі публіцыстычны, але і навуковы характар.

У той час аўтары (П. М. Бацюшкаў, Р. Я. Кіпрыяновіч, А. І. Мілавідаў) шмат увагі ўдзялялі дзейнасці віленскага генерал-губернатара М. Мураўёва. Яны імкнуліся раскрыць яго палітыку ў дачыненні да каталіцкага насельніцтва і духавенства. Станоўча ацэньвалася прыняцце каталікамі праваслаўя і павелічэнне колькасці праваслаўных прыходаў за кошт ліквідаваных каталіцкіх [1, с. 372]. З негатыўнага пункта гледжання падаваўся ўплыў каталіцкіх ксяндзоў на праваслаўнае насельніцтва, падкрэслівалася іх імкненне перацягнуць вернікаў з праваслаўя, асвятляліся перашкоды, якія чыніліся ксяндзамі пры спробах заключэння змяшаных шлюбаў (паміж праваслаўнымі і каталікамі). Пры даследаванні гісторыі праваслаўя адзначалася характэрная для беларускіх тэрыторый з'ява, калі прадстаўнікі праваслаўнай канфесіі маглі наведваць каталіцкія храмы. Відавочна, гісторыкі царквы адмоўна ўспрымалі такую тэндэнцыю і тлумачылі яе «польскай» і «лацінскай» прапагандай [2, с. 220].

Сярод аўтараў канца XIX – пачатку XX ст. бытавала меркаванне, што пераход каталікоў у праваслаўе адбываўся цалкам на добраахвотнай аснове. Але адначасова з гэтым гісторык А. Мілавідаў прызнаваў, што падчас акцый па такім пераводзе мела месца садзейнічанне духавенству з боку цывільных улад [3, с. 65].

У цэлым працы таго часу былі вытрыманы ў рэчышчы безумоўнай падтрымкі афіцыйных мерапрыемстваў у дачыненні да каталіцызму на тэрыторыі Беларусі.

У гэты час таксама працавалі навукоўцы, якія па-іншаму спрабавалі разглядаць праблему адносін паміж рознымі канфесіямі ў беларускіх губернях. Пры даследаванні становішча праваслаўнай царквы А. Уладзіміраў крытычна ацэньваў некаторыя захады, якія адбываліся падчас масавых мерапрыемстваў па пераводах. У памылковасці дзеянняў улад ён бачыў прычыны, па якіх вялікая колькасць з тых, хто прыняў праваслаўе, фактычна заставаліся каталікамі [4, с. 52]. Яго працу станоўча ацаніў праваслаўны святар і пісьменнік І. Фудэль. Ён, у сваю чаргу, спрабаваў прааналізаваць і вызначыць наступствы канфесійных канверсій і прыйшоў да высновы, што рэлігійныя пытанні не могуць вырашацца палітычнымі сродкамі. І. Фудэль лічыў, што праблему наяўнасці «ўпартых у лацінстве» можна вырашыць толькі штодзённай працай святара са сваімі прыхаджанамі, а не ціскам і прымусам [5, с. 4].

Найбольш паслядоўна крытыкай адміністрацыйнага характару пераводаў займаўся праваслаўны святар М. Д. Ізвекаў. Асаблівую ўвагу ён звяртаў на нежаданне далучаных да праваслаўя каталікоў выконваць абрады прынятай канфесіі [6, с. 273]. У выдадзенай у 1899 г. працы прадэманстраваны наступствы прымусовых пераводаў у праваслаўе, калі яны не былі падмацаваны ўнутранымі духоўнымі памкненнямі вернікаў і прыводзілі да адкрытага вяртання людзей у заходні абрад групамі ці паасобку. Аднак М. Д. Ізвекаў не пазбег традыцыйных для расійскай грамадскай думкі фармулёвак і характарызаваў каталікоў і «ўпартых у лацінстве» як прыхільнікаў усяго польскага і ворагаў праваслаўя. Але ён фактычна першым у дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі грунтоўна, з апорай на крыніцы, паказаў пераважна гвалтоўны характар пераводу часткі каталіцкага насельніцтва беларускіх губерняў у праваслаўе.

Іншую пазіцыю ў параўнанні з расійскімі публіцыстамі і гісторыкамі займалі прадстаўнікі краёвай плыні ў грамадскай думцы беларускіх губерняў. У 1895 г. свае разважанні па пытаннях этнаканфесійных стасункаў і ажыццяўленні рэлігійнай палітыкі ў Беларусі і Літве апублікаваў граф А. Тышкевіч. Абапіраючыся на заканадаўчую базу, ён спрабаваў аб'ектыўна прааналізаваць польска-расійскія адносіны ў другой палове XIX ст. і вызначыць змены ў становішчы каталіцызму ў рэгіёне пасля паўстання 1863–1864 гг. А. Тышкевіч разглядаў праблему наяўнасці ў беларускіх губернях так званых упартых і адзначаў, што падчас візітаў каталіцкіх біскупаў у асобныя парафіі да іх звярталіся для споведзі і прычасця вялікая колькасць фармальна праваслаўных вернікаў [7, с. 104].

Аўтары другой паловы XIX і пачатку XX ст. перш за ўсё імкнуліся адлюстраваць добраахвотнасць пераходаў вернікаў з каталіцызму ў праваслаўе. Іх цікавіла не столькі непасрэднае ажыццяўленне канверсій, стаўленне да іх людзей, у дачыненні да якіх яны ажыццяўляліся, колькі абгрунтаванне гістарычнай неабходнасці «вяртання» каталіцкага насельніцтва беларускіх губерняў у праваслаўе. Аднак у канцы XIX ст. пачалі з'яўляцца больш

аб'ектыўныя працы, якія грунтаваліся на сур'ёзнай заканадаўчай базе і вялікай колькасці крыніц, на падставе чаго аўтары разглядалі канфесійныя адносіны на тэрыторыі Беларусі, аналізавалі пераход часткі каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе як складнік рэлігійнай палітыкі расійскіх улад. Пераважная большасць падобных даследчыкаў у гэты час засяроджваліся на функцыянаванні касцёла як грамадскага інстытута, дзейнасці рымска-каталіцкага духавенства (перш за ўсё прадстаўнікоў вышэйшай іерархіі), спробах русіфікацыі і распалячвання касцёла (увядзенне рускай мовы замест польскай у дадатковае набажэнства) і рэакцыі на іх з боку вернікаў. Істотна менш увагі надавалася праблематыцы ўласна канфесійных канверсій на лакальным узроўні, амаль не было даследавана (за выключэннем працы М. Д. Ізвекава) пытанне, як адбывалася змаганне за вернікаў не толькі на ўзроўні заканадаўства, але і на месцах.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі традыцыі расійскай дарэвалюцыйнай навукі працягвалі гісторыкі царквы ў эміграцыі. З іх канфесійныя канверсіі ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. найбольш падрабязна даследаваў І. Смоліч. На яго думку, праваслаўная царква ў другой палове XIX ст. не вяла актыўную місіянерскую дзейнасць сярод каталіцкага (і былога ўніяцкага) насельніцтва беларускіх зямель, што прывяло да невялікай колькасці далучаных да праваслаўя ў другой палове 1860-х гг. [8, с. 306–307].

Што тычыцца часу функцыянавання савецкай гістарычнай навукі (1920–80-я гг.), то тэма канфесійных канверсій фактычна не атрымала ў ёй раскрыцця. Для пачынальнікаў беларускай гістарыяграфіі (В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, М. Доўнар-Запольскі) і даследчыкаў міжваеннага перыяду пытанні канфесійнай гісторыі не ўваходзілі ў сферу галоўных навуковых інтарэсаў. У. Ігнатоўскі ў працэсе пераводу і праследаванні былых каталіцкіх вернікаў бачыў не этнаканфесійны феномен, а складовую частку дзеянняў расійскіх улад па эксплуатацыі беларускага сялянства [9, с. 148].

У савецкі час пытанні канфесійнай гісторыі закраналіся, але даследаваліся на падставе марксісцка-ленінскай ідэалогіі і асэнсоўваліся ў рэчышчы барацьбы працоўных мас супраць рэлігійнага прыгнёту, які ажыццяўляўся як каталіцкай, так і праваслаўнай царквой [10]. У гэтым кантэксце пытанню гвалтоўнага пераводу ў праваслаўе ў другой палове XIX ст. не надавалася значнай увагі. Толькі даследчыца дзяржаўнай палітыкі на беларускіх землях С. Самбук адзначыла прыклады супраціўлення прымусоваму пераводу і справядліва падкрэсліла актыўную пазіцыю сялян у справе абароны ўласнай канфесійнай прыналежнасці [11, с. 144].

Новы этап вывучэння канфесійных канверсій пачаўся з 1990-х гг. Тады ж пачалі выходзіць абагульняючыя працы, прысвечаныя гісторыі канфесій на беларускіх землях падчас іх знаходжання ў складзе Расійскай імперыі. У 1998 г. пабачыла свет калектыўнае даследаванне (пад рэдакцыяй У. Навіцкага), якое з'яўлялася першай спробай асвятліць праблемы гісторыі канфесій з пункта гледжання сучасных навуковых падыходаў [12].

Далейшае развіццё канфесійная праблематыка атрымала ў манаграфіі В. Яноўскай (Грыгор'евай). З выкарыстаннем шматлікіх архіўных матэрыялаў даследчыца прааналізавала працэс замацавання праваслаўнай царквы ў якасці пануючай пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. [13].

З найноўшых абагульняючых прац варта згадаць створаную калектывам аўтараў манаграфію «Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)», дзе разглядаецца працэс уключэння праваслаўнай і каталіцкай цэркваў беларускіх губерняў у прававую прастору Расійскай імперыі [14].

Да прац, якія непасрэдна прысвечаны праблематыцы пераводу ў праваслаўе, належыць манаграфія доктара гістарычных навук А. Бендзіна [15]. У кнізе аналізуюцца канфлікты і супярэчнасці, якія ўзнікалі на рэлігійнай аснове ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. На падставе шматлікіх крыніц прасочваецца працэс пераводу ў праваслаўе. У сваёй працы А. Бендзін фактычна салідарызаваўся з расійскай дзяржаўнай палітыкай у характарыстыцы каталіцкага насельніцтва, якое не жадала пераходзіць у праваслаўе. Гэты дастаткова шырокі народны рух даследчык акрэсліў як «нелегальное движение упорствующих в латинстве» і звёў яго вытокі амаль выключна да выніку агітацыі з боку каталіцкага духавенства і буйных землеўласнікаў [15, с. 22].

Па-іншаму да вывучэння пераводу з каталіцтва ў праваслаўе падышоў А. Грахоцкі. Ён ахарактарызаваў пытанне прававога рэгулявання міжканфесійных пераходаў і акрэсліў заканадаўчыя нормы, у адпаведнасці з якімі маглі ажыццяўляцца пераходы [16, с. 5]. Навуковец паспрабаваў рэканструяваць працэс пераводу каталіцкіх вернікаў у праваслаўе пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. [17, с. 22].

Разнастайныя аспекты, звязаныя з суіснаваннем праваслаўнай і каталіцкай канфесій на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX – пачатку XX ст., у сваіх даследаваннях закранаў В. Табуноў, які ў 2008 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па гэтай праблематыцы [18]. Ім акрэслена розніца ў прававым становішчы паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі, якая заключалася ў пануючым статусе першай з іх і існаванні абмежаванняў для дзейнасці другой [19, с. 12]. Таксама ён прааналізаваў узаемаадносіны паміж праваслаўнымі і каталікамі і выказаў меркаванне пра нецярпімасць паміж прадстаўнікамі розных канфесій.

У артыкуле А. Пятчыца падрабязна разбіраецца працэдура пераходу ў праваслаўе і наступствы, якія

яна выклікала. Даследчык адзначыў, што сярод прычын прыняцця праваслаўя, асабліва людзьмі шляхецкага паходжання, прысутнічалі і меркантыльныя, напрыклад спадзяванні пазбегнуць падазрэнняў ва ўдзеле ў паўстанні 1863–1864 гг. [20, с. 53].

Іншы аспект канфесійных канверсій прааналізаваў В. Урублеўскі. Ён разгледзеў праблему парушэння пахавальнай абраднасці, якія з пункта гледжання праваслаўнай царквы дапускалі былыя каталікі. Яны адкрыта выказвалі нязгоду выконваць пахавальныя абрады паводле праваслаўнай традыцыі [21, с. 290]. В. Лінкевіч звярнуў увагу на праблему існавання міжканфесійных пераходаў і змяшаных шлюбаў у кантэксце барацьбы каталіцкага і праваслаўнага духавенства за прыхаджан [22, с. 263].

Апрача спецыяльных даследаванняў, міжканфесійныя пераходы вывучаюцца навукоўцамі ў кантэксце больш шырокіх тэм, перш за ўсё звязаных з гісторыяй асобных рэлігійных супольнасцей, міжканфесійных адносін, а таксама этнаканфесійных працэсаў.

Манаграфія А. Ганчара прысвечана праблеме дзейнасці касцёла ў другой палове XIX ст. [23]. У ёй сярод іншага даецца падрабязная характарыстыка захадам, якія рабілі касцёльная іерархія і шараговыя святары для супрацьстаяння абмежаванням, накладзеным дзяржавай на іх канфесію.

Да пытання міжканфесійных пераводаў у 1860-я гг. звярнуўся А. Смалянчук. Аўтар акрэсліў дзейнасць спецыяльнай рэвізійнай камісіі і яе дасягненні ў справе пераводу насельніцтва з каталіцызму ў праваслаўе, а таксама пераважна адмоўную рэакцыю насельніцтва на іх [24, с. 63].

П. Церашковіч паставіў пытанне пераводу ў праваслаўе ў кантэкст скарачэння колькаснай вагі каталіцкага насельніцтва і даў ацэнку падобным захадам як мэтанакіраванай імперскай палітыцы. Ён прыйшоў да высновы, што вынікам прымусовай канверсіі насельніцтва стала стварэнне сітуацыі нестабільнасці і зменлівай этнаканфесійнай ідэнтычнасці на беларускіх землях [25, с. 216].

У рэчышчы ўзрастання цікавасці да рэгіянальнай гісторыі звяртаецца ўвага на выпадкі масавых пераводаў у праваслаўе, якія назіраліся ў асобных рэгіёнах – паветах і нават прыходах. Міжканфесійныя пераходы на Гродзеншчыне закранаалі Т. Казлова [26, с. 79] і В. Працэнка [27, с. 230], канфесійную сітуацыю ў Пінскім павеце даследавала К. Марозька [28, с. 239], практыкі пераводу на Мазыршчыне разглядала З. Кур'ян [29, с. 33].

У замежнай гістарыяграфіі найбольшая цікавасць да праблемы пераводу ў праваслаўе ў беларускіх губернях у другой палове XIX – пачатку XX ст. назіраецца ў расійскай, польскай і літоўскай гістарыяграфічных традыцыях.

Як і ў беларускай гістарыяграфіі, інтарэс да канфесійнай гісторыі ў расійскай навуцы стаў імкліва ўзрастаць пачынаючы з 1990-х гг. Вядомы даследчык польска-расійскіх узаемаадносін Л. Гарызонтаў у працы «Парадоксы імперскай палітыкі: палякі ў Расіі і рускія ў Польшчы» (1999) сярод іншага ахарактарызаваў праблематыку змяшаных шлюбаў паміж вернікамі праваслаўнай і каталіцкай канфесій [30]. У даследаванні прааналізаваны прававая рэгламентацыя і фактычнае заключэнне такіх шлюбаў, але ў асноўным на падставе прыкладаў з жыцця вышэйшых саслоўяў. Уплыў змяшаных шлюбаў на рэлігійную ідэнтычнасць прадстаўнікоў мяшчанства і сялянства ў кнізе не закранаецца.

Разнастайны матэрыял па пытанні канверсій з каталіцызму ў праваслаўе змяшчае манаграфія расійскага гісторыка М. Д. Далбілава «Рускі край, чужая вера: этнаканфесійная палітыка імперыі ў Літве і Беларусі пры Аляксандры II» (2010) [31]. Ажыццяўленне пераводу ў праваслаўе разгледжана і прааналізавана аўтарам у шырокім кантэксце трансфармацыі падыходаў расійскіх улад у адносінах з «замежнымі» веравызнаннямі. Гісторык падкрэслівае наяўнасць унутраных супярэчнасцей у канфесійнай палітыцы ў краі, яе непаслядоўнасць, якая абумоўлівалася барацьбой розных палітычных груповак унутры расійскіх дзяржаўных эліт. Несумненна, гэта найбольш поўнае ў расійскай гістарыяграфіі даследаванне, прысвечанае праблематыцы дзяржаўных мерапрыемстваў, накіраваных на ўзмацненне ролі праваслаўя ў беларускіх губернях. Тым не менш, як і яго папярэднікі, М. Д. Далбілаў у першую чаргу засяроджваецца на захадах, якія рабіліся цэнтральнымі і мясцовымі ўладамі, у меншай ступені ў яго даследаванні прасочваецца, як адбывалася рэалізацыя прынятых на агульнадзяржаўным і лакальным узроўнях рашэнняў, як на іх рэагавала насельніцтва. У сваю чаргу, прававыя аспекты праследавання за «выхад з праваслаўя» ў розных частках Расійскай імперыі прасачыў В. Андрашчук [32].

Польскія даследчыкі ў сваіх працах таксама звярталіся да асвятлення розных аспектаў расійскай рэлігійнай палітыкі ў беларускіх губернях. Сярод найбольш ранніх даследаванняў неабходна вылучыць працы А. Важынскага (1872) [33] і З. Нагродскага (1935) [34], аднак у іх увага засяроджвалася на пытаннях закрыцця касцёлаў, праследавання ксяндзоў, палітыкі распалячвання касцёла. У сучаснай польскай гістарыяграфіі перавод у праваслаўе асэнсоўваецца перш за ўсё ў больш шырокім кантэксце рэлігійнай і этнаканфесійнай гісторыі беларускіх зямель [35].

Сярод прадстаўнікоў іншых замежных гістарыяграфічных традыцый у першую чаргу варта адзначыць літоўскага гісторыка Д. Сталюнаса [36] і амерыканскіх даследчыкаў Т. Уікса [37] і П. Верта [38], якія вывучаюць праблему далучэння каталіцкага насельніцтва да праваслаўя ў 1860-х гг. Іх даследаванні грунтуюцца пераважна на крыніцах з Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў.

## Заключэнне

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі асноўную цікавасць да пытанняў канфесійных канверсій выказвалі расійскія гісторыкі царквы. Як правіла, у сваіх даследаваннях яны імкнуліся паказаць добраахвотнасць працэсу пераходу з каталіцызму ў праваслаўе. Зрэшты былі і выключэнні, да якіх найперш належыць праца М. Д. Ізвекава.

У савецкай гістарыяграфіі праблема пераводу ў праваслаўе і рэакцыі на яго з боку насельніцтва амаль не закраналася, затое ў цяперашні час цікавасць да яе істотна павялічылася. Даследчыкі засяроджваюцца на заканадаўчых асновах і фактычнай рэалізацыі працэдуры пераводу ў праваслаўе ў другой палове XIX ст., спыняюцца на канкрэтных рэгіёнах, дзе пытанне міжканфесійных узаемаадносін стаяла асабліва востра. Нягледзячы на наяўнасць грунтоўных прац высокага навуковага ўзроўню неабходна адзначыць, што ў шэрагу выпадкаў у сучаснай гістарыяграфіі паўтараюцца ідэі, прапанаваныя ў дарэвалюцыйнай навуцы, – адмаўленне наяўнасці ў беларускага сялянства развітой канфесійнай ідэнтычнасці, апраўданне правядзення прымусовых канверсій, імкненне абвінаваціць каталіцкіх святароў і памешчыкаў у правакаванні сялян да адмаўлення ад праваслаўя.

Сучасныя замежныя даследчыкі пераважна вывучаюць перавод з каталіцызму ў праваслаўе ў кантэксце зменлівай дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі. Яны разглядаюць прымусовыя канверсіі як частку маштабных, навязаных звонку, рэлігійных пераўтварэнняў, якія адбываліся на беларускіх землях пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. У меншай ступені ў іх працах увага звяртаецца на рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі на месцах і рэакцыю насельніцтва на яе.

Падсумоўваючы, неабходна адзначыць, што ў гістарыяграфіі недастаткова закранaлася праблематыка канфесійных канверсій і пераводу каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе на лакальным узроўні, амаль не даследаваны формы змагання праваслаўнага і каталіцкага духавенства за вернікаў у асобных паветах і нават прыходах, выпадкі сутыкнення дзяржаўнай працэдуры пераводу ў праваслаўе з уяўленнямі вернікаў пра сваю рэлігійную ідэнтычнасць.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Батюшков ПН. *Белоруссия и Литва: исторические судьбы Северо-Западного края.* Санкт-Петербург: Типография товарищества «Общественная польза»; 1890. 183 с.

2. Киприанович ГЯ. *Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве.* Вильна: Типография И. Блюмовича; 1895. 225 с.

3. Миловидов АИ. *Заслуги графа М. Н. Муравьева для православной церкви в Северо-Западном крае.* Харьков: Типография Губернского правления; 1900. 92 с.

4. Владимиров АП. *О положении православия в Северо-Западном крае.* Москва: Русское обозрение; 1893. 92 с.

5. Фудель ИИ. *Наше дело в Северо-Западном крае.* Москва: Университетская типография; 1893. 38 с.

6. Извеков НД. *Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839–1889 г.* Москва: Печатня А. И. Снегиревой; 1899. 522 с.

7. Тышкевич А. *Русско-польские отношения.* Лейпциг: [б. и.]; 1895. 252 с.

8. Смолич ИК. *История Русской церкви, 1700–1917 гг.* Москва: Издательство Валаамского Спасо-Преображенского монастыря; 1997. 799 с.

9. Ігнатоўскі УМ. *Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця: лекцыі, чытаныя студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.* Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі; 1925. 251 с.

10. Мараш ЯН. *Из истории борьбы народных масс Белоруссии против экспансии католической церкви.* Минск: Вышэйшая школа; 1969. 220 с.

11. Самбук СМ. *Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века.* Минск: Наука и техника; 1980. 223 с.

12. Навіцкі УІ, рэдактар. *Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.).* Мінск: Экаперспектыва; 1998. 339 с.

13. Яноўская ВВ. *Хрысціянская царква ў Беларусі, 1863–1914 гг.* Мінск: БДУ; 2002. 197 с.

14. Яноўская ВВ, рэдактар. *Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.).* Мінск: Беларуская навука; 2015. 496 с.

15. Бендин АЮ. *Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.).* Минск: БГУ; 2010. 439 с.

16. Грахоцкі АП. Прававое рэгуляванне парадку рэлігійнай канверсіі ў Беларусі (1863–1905 гады). *Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні.* 2012;1:4–18.

17. Грахоцкі АП. «Возвращение в православие»: масавая канверсія каталікоў Беларусі ў праваслаўе ў 60-я гады XIX ст. (па матэрыялах Мінскай губерні). У: Міхедзька ВА, рэдактар. *Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы. Частка 1.* Гомель: [б. в.]; 2009. с. 21–31.

18. Табунов ВВ. *Политика российского правительства в отношении христианских конфессий в Беларуси (1895–1907)* [автореферат диссертации]. Минск: БГПУ; 2008. 22 с.

19. Табунов ВВ. Регламентация законодательством Российской империи деятельности православной церкви и римско-католического костела в Беларуси конца XIX – начала XX в. *Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя A. Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія).* 2012;1:10–13.

20. Пятчиц АИ. «Торжество» православия в Беларуси: имперский вариант. *Деды: дайджест публикаций о белорусской истории.* 2010;5:40–55.

21. Урублеўскі ВВ. Парушэнне праваслаўнай царкоўнай практыкі пахавання як адлюстраванне працэсу супрацьстаяння каталікоў ліквідаваных парафій масаваму пераводу ў праваслаўе (другая палова XIX – пачатак XX ст.). *Архіварыус*. 2017;15:284–294.
22. Линкевич ВН. Взаимоотношения православного и католического населения Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. В: Марозава СВ, рэдактар. *Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа. Частка 1.* Гродна: [б. в.]; 2009. с. 262–267.
23. Ганчар АИ. *Римско-католический костел в Беларуси (1864–1905 гг.).* Гродно: ГГАУ; 2008. 275 с.
24. Смалянчук АФ. *Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях 1864–1917 г.* Гродна: ГрДУ; 2001. 320 с.
25. Терешкович ПВ. Пограничье как судьба: метаморфозы этничности в Восточноевропейском пограничье в XIX – начале XX в. *Ab Imperio*. 2009;1:191–226.
26. Козлова ТИ. Конфессиональный облик населения Гродненской губернии (1801–1914 гг.). *Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія*. 2007;4:76–81.
27. Проценко ОЭ. Конфессиональный аспект истории Гродненской губернии в XIX в. У: Марозава СВ, рэдактар. *Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа. Частка 1.* Гродна: [б. в.]; 2009. с. 229–236.
28. Морозько ЕВ. Изменение религиозной ситуации на Пинщине после восстания 1863–1864 гг. В: Чесновский МЭ, редактор. *Национализм и концепция гражданского общества в Восточной Европе.* Брест: [б. и.]; 2009. с. 236–243.
29. Курьян ЗС. К вопросу о взаимоотношениях православных и католиков в Мозырском уезде в XIX веке. У: Міхедзька ВА, рэдактар. *Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы.* Гомель: [б. в.]; 2011. с. 29–33.
30. Горизонтов ЛЕ. *Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше (XIX – начало XX в.).* Москва: Индрик; 1999. 272 с.
31. Долбилов МД. *Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II.* Москва: Новое литературное обозрение; 2010. 999 с.
32. Андрощук ВВ. *Преступления против религии по законодательству России (конец XIX – начало XX в.).* Москва: Юриспруденция; 2016. 208 с.
33. Ważyński A. *Litwa pod względem prześladowania w niej Rzymsko-katolickiego Kościoła.* Poznań: W. Decker i Spółka; 1872. 107 s.
34. Nagrodzki Z. *Rola duchowieństwa katolickiego w godzinie prób i cierpień na terenach Litwy i Białorusi (1863–1883).* Wilno: Dom Książki Polskiej; 1935. 145 s.
35. Mironowicz A. *Kościół prawosławny w Polsce.* Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne; 2006. 920 s.
36. Staliūnas D. *Making Russians. Meaning and practice of russification in Lithuania and Belarus after 1863.* New York: Rodopi B. V.; 2007. 465 p.
37. Weeks T. *Nation and state in late imperial Russia: nationalism and russification on Russia's western frontier, 1863–1914.* Northern Illinois: Northern Illinois University Press; 1996. 297 p.
38. Верт П. *Православие, инославие, иноверие: очерки по истории религиозного разнообразия Российской империи.* Москва: Новое литературное обозрение; 2012. 275 с.

## References

1. Batyushkov PN. *Belorussiya i Litva: istoricheskie sud'by Severo-Zapadnogo kraya* [Belarus and Lithuania: historical fates of the Northwest lands]. Saint Petersburg: Tipografiya tovarishhestva «Obshchestvennaya pol'za»; 1890. 183 p. Russian.
2. Kiprianovich GYa. *Istoricheskii ocherk pravoslaviya, katolichestva i unii v Belorussii i Litve* [Historical essay on Orthodoxy, Catholicism and the union in Belarus and Lithuania]. Vil'na: Tipografiya I. Blyumovicha; 1895. 225 p. Russian.
3. Milovidov AI. *Zaslugi grafa M. N. Murav'eva dlya pravoslavnoi tserkvi v Severo-Zapadnom krae* [Merits of count M. N. Muravyov for the Orthodox Church in the Northwest lands]. Kharkiv: Tipografiya Gubernskogo pravleniya; 1900. 92 p. Russian.
4. Vladimirov AP. *O polozhenii pravoslaviya v Severo-Zapadnom krae* [On the state of Orthodoxy in Northwest lands]. Moscow: Russkoe obozrenie; 1893. 92 p. Russian.
5. Fudel' II. *Nashe delo v Severo-Zapadnom krae* [Our deal is in the Northwest lands]. Moscow: Universitetskaya tipografiya; 1893. 38 p. Russian.
6. Izvekov ND. *Istoricheskii ocherk sostoyaniya pravoslavnoi tserkvi v Litovskoi eparkhii za vremya s 1839–1889 g.* [Historical essay of the state of the Orthodox Church in the Lithuanian diocese during the period of 1839–1889 years]. Moscow: Pechatnya A. I. Snegirevoi; 1899. 522 p. Russian.
7. Tyshkevich A. *Russko-pol'skie otnosheniya* [Russian-Polish relations]. Leipzig: [s. n.]; 1895. 252 p. Russian.
8. Smolich IK. *Istoriya Russkoi tserkvi, 1700–1917 gg.* [The Russian Church history, 1700–1917]. Moscow: Publishing house of Valaam Monastery; 1997. 799 p. Russian.
9. Ignatowski UM. *Gistoryja Belarusi w XIX i w pachatku XX staleccja: lekcyi, chytanyja studjentam Belaruskaga dzjarzhawnaga wniversitjetu* [History of Belarus in the 19th and early 20th century: lectures given to students of the Belarusian State University]. Minsk: Dzjarzhawnae vydavectva Belarusi; 1925. 251 p. Belarusian.
10. Marash YaN. *Iz istorii bor'by narodnykh mass Belorussii protiv ekspansii katolicheskoi tserkvi* [From the history of the Belarusian people's struggle against the expansion of Catholic Church]. Minsk: Vyshjejshaja shkola; 1969. 220 p. Russian.
11. Sambuk SM. *Politika tsarizma v Belorussii vo vtoroi polovine XIX veka* [The policy of tsarism in Belarus in the second half of the 19th century]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1980. 223 p. Russian.
12. Navicki UI, editor. *Kanfesii na Belarusi (kanec XVIII – XX st.)* [Confessions in Belarus (the end of the 18th – 20th century)]. Minsk: Jekaperspektyva; 1998. 339 p. Belarusian.
13. Janowskaja VV. *Hryscijanskaja carkva w Belarusi, 1863–1914 gg.* [Christian Church in Belarus, 1863–1914]. Minsk: Belarusian State University; 2002. 197 p. Belarusian.

14. Janowskajа VV, editor. *Kanfesijny faktar u sacyjal'nym razvicci Belarusi (kanec XVIII – pachatak XX st.)* [The confessional factor in the social development of Belarus (late 18th – early 20th century)]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2015. 496 p. Belarusian.
15. Bendin AYu. *Problemy veroterpimosti v Severo-Zapadnom krae Rossiiskoi imperii (1863–1914 gg.)* [The tolerance problems in the Northwest lands of the Russian Empire (1863–1914)]. Minsk: Belarusian State University; 2010. 439 p. Russian.
16. Grahocki AP. [Legal regulation of the procedure for conversion in Belarus (1863–1905)]. *Sacyjal'na-jekanamichnyja i pravavyja dasledavanni.* 2012;1:4–18. Belarusian.
17. Grahocki AP. [«Return to Orthodoxy»: the mass conversion of Belarusian Catholics to Orthodoxy in the 1860s (based on the materials of the Minsk governorate)]. In: Mihedz'ka VA, editor. *Belarus' u gistarychnaj rjetraspektyve XIX–XX stagoddzjaw: jetnakul'turnyja i nacyjanal'na-dzjarzhawnyja pracjesy. Chastka 1* [Belarus in the historical retrospective of the 19th–20th centuries: ethnocultural and national-state processes. Part 1]. Homieĺ: [s. n.]; 2009. p. 21–31. Belarusian.
18. Tabunov VV. *Politika rossiiskogo pravitel'stva v otnoshenii hristianskikh konfessii v Belarusi (1895–1907)* [Russian government policy on the Christian confessions in Belarus (1895–1907)] [dissertation abstract]. Minsk: Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank; 2008. 22 p. Russian.
19. Tabunov VV. [Regulation of the activities of the Orthodox Church and the Roman Catholic Church in Belarus by the legislation of the Russian Empire in the late 19th – early 20th centuries]. *Vesnik Magiljowskaga dzjarzhawnaga wniversitjeta imja A. A. Kuljashova. Seryja A. Gumanitarnyja navuki (gistoryja, filasofija, filalogija).* 2012;1:10–13. Russian.
20. Pyatchits AI. [«Triumph» of Orthodoxy in Belarus: the imperial version]. *Dedy: daidzhest publikatsii o belorusskoi istorii.* 2010;5:40–55. Russian.
21. Urublewski VV. [The violation of the Orthodox tradition of interment as a manifestation of the process of resistance of the Catholics of the eliminated parishes towards conversions into Orthodox Christianity in the Minsk governorate (late 19th – early 20th century)]. *Arhivaryus.* 2017;15:284–294. Belarusian.
22. Linkevich VN. [Relationships between the Orthodox and Catholic populations of Belarus in the second half of the 19th – early 20th century]. In: Marozava SV, editor. *Hryscijanstva w gistarychnym ljose belaruskaga naroda. Chastka 1* [Christianity in the historical destiny of the Belarusian people. Part 1]. Hrodna: [s. n.]; 2009. p. 262–267. Russian.
23. Ganchar AI. *Rimsko-katolicheskii kostel v Belarusi (1864–1905 gg.)* [The Roman Catholic Church in Belarus (1864–1905)]. Hrodna: Grodno State Agrarian University; 2008. 275 p. Russian.
24. Smaljanchuk AF. *Pamizh krajovascju i nacyjanal'naj idjejaj. Pol'ski ruh na belaruskih i litowskih zemljah 1864–1917 g.* [Between regionalism and the national idea. Polish movement in the Belarusian and Lithuanian lands 1864–1917]. Hrodna: Yanka Kupala State University of Grodno; 2001. 320 p. Belarusian.
25. Tereshkovich PV. [Borderlands as destiny: metamorphoses of ethnicity in the Eastern European borderlands in the 19th – early 20th centuries]. *Ab Imperio*. 2009;1:191–226. Russian.
26. Kozlova TI. [Confessional image of the population of Hrodna governorate (1801–1914)]. *Vesnik Grodzenskaga dzjarzhawnaga wniversitjeta imja Janki Kupaly. Seryja 1. Gistoryja i arhealogija. Filasofija. Palitalogija.* 2007;4:76–81. Russian.
27. Protsenko OE. [The confessional aspect of the history of the Hrodna governorate in the 19th century]. In: Marozava SV, editor. *Hryscijanstva w gistarychnym ljose belaruskaga naroda: zbornik navukovyh artykulaw. Chastka 1* [Christianity in the historical destiny of the Belarusian people. Part 1]. Hrodna: [s. n.]; 2009. p. 229–236. Russian.
28. Moroz'ko EV. [Change the religious situation in the Pinsk region after the uprising of 1863–1864]. In: Chasnouski ME, editor. *Natsionalizm i kontseptsiya grazhdanskogo obshchestva v Vostochnoi Evrope* [Nationalism and the concept of civil society in Eastern Europe]. Brest: [s. n.]; 2009. p. 236–243. Russian.
29. Kur'yan ZS. [To the issue of the relationships between Orthodox and Catholics in the Mazyr district in the 19th century]. In: Mihedz'ka VA, editor. *Belarus' u gistarychnaj rjetraspektyve XIX–XX stagoddzjaw: jetnakul'turnyja i nacyjanal'na-dzjarzhawnyja pracjesy* [Belarus in the historical retrospective of the 19th–20th centuries: ethnocultural and national-state processes]. Homieĺ: [s. n.]; 2011. p. 29–33. Russian.
30. Gorizontov LE. *Paradoksy imperskoi politiki: polyaki v Rossii i russkie v Pol'she (XIX – nachalo XX v.)* [The paradoxes of imperial policy: Poles in Russia and Russians in Poland (19th – early 20th century)]. Moscow: Indrik; 1999. 272 p. Russian.
31. Dolbilov MD. *Russkii krai, chuzhaya vera: etnokonfessional'naya politika imperii v Litve i Belorussii pri Aleksandre II* [Russian lands, foreign faith: ethnoconfessional policy of the empire in Lithuania and Belarus under Alexander II]. Moscow: Novoe literaturnoe obozrenie; 2010. 999 p. Russian.
32. Androshchuk VV. *Prestupleniya protiv religii po zakonodatel'stvu Rossii (konets XIX – nachalo XX v.)* [Crimes against religion under Russian law (late 19th – early 20th century)]. Moscow: Yurisprudentsiya; 2016. 208 p. Russian.
33. Ważyński A. *Litwa pod względem prześladowania w niej Rzymsko-katolickiego Kościoła.* Poznań: W. Decker i Spółka; 1872. 107 s.
34. Nagrodzki Z. *Rola duchowieństwa katolickiego w godzinie prób i cierpień na terenach Litwy i Białorusi (1863–1883).* Wilno: Dom Książki Polskiej; 1935. 145 s.
35. Mironowicz A. *Kościół prawosławny w Polsce*. Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne; 2006. 920 s.
36. Staliūnas D. *Making Russians. Meaning and practice of russification in Lithuania and Belarus after 1863.* New York: Rodopi B. V.; 2007. 465 p.
37. Weeks T. *Nation and state in late imperial Russia: nationalism and russification on Russia's western frontier, 1863–1914.* Northern Illinois: Northern Illinois University Press; 1996. 297 p.
38. Vert P. *Pravoslavie, inoslavie, inoverie: ocherki po istorii religioznogo raznoobraziya Rossijskoi imperii* [Orthodoxy, non-Orthodoxy, Heterodoxy: sketches on the history of religious diversity in the Russian Empire]. Moscow: Novoe literaturnoe obozrenie; 2012. 275 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 18.09.2020.*
*Received by editorial board 18.09.2020.*